**І.Н. Колабава (Мінск)**

# СУДОВАЯ СПРАВА ВІЦЕБСКАГА КУПЦА АЛЯКСЕЯ САЛОМІНА (1858 г.)

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваецца даволі аб'ёмная справа 1858 — 1868 гадоў па выяўленні сеткі віцебскіх фальшываманетчыкаў (ф. 1430, воп.1, спр. 30 391).

Адным з найбольш цікавых фігурантаў гэтай справы з'уляецца віцебскі купец 2 гільдыі Аляксей Саломін, які ў 1864 годзе накіраваў зварот да імператара Аляксандра II, дзе пералічваў усе страты, што панёс на працягу таго часу, калі знаходзіўся ў вязніцы па абвінавачванні ў фальшэрстве манет. Аляксей Саломін меў падрад на будаўніцтва шасэйнай дарогі Віцебск — Магілёў. За страчаныя харчовыя запасы, будаўнічыя прылады, камні для будаўніцтва дарогі, перанесеную ганьбу, 4-гадовыя пакуты і разбурэнне здароў'я ён просіць кампенсацыю ў сто адзінаццаць тысяч рублёў [5, л. 306].

Гэтаму дакументу папярэднічала працяглая гісторыя...

18 чэрвеня 1857 года віцебскаму губернатару паступіла прашэнне купца Саломіна, ў якім ён піша, што 12 чэрвеня быў арыштаваны па справе аб падкінутых у яго кватэру штэмпелях для чаканкі фальшывай манеты. Саломін паведамляе, што «дверь занимаемой мной комнаты была отбита во время отсутствия моего перед самым обыском <...> ». У паліцыі Саломін сустрэў мясцовага жыхара Арона Гурвіча і ратмана Зэліксона, якіх і лічыў вінаватымі ў падкладанні яму штэмпеляў [5, л. 104 — 104 аб.].

23 чэрвеня 1857 года з'явілась прашэнне жыхаркі Ковенскага павета Малкі Саломінай з просьбай вызваліць на паручэнства яе супруга, які стаў ахвярай лібавінскіх яўрэяў-хасідаў. Сутнасць узнікнуўшага канфлікта яна вызначыла наступным чынам: «зять главного раввина <...> купец Левик <...> захватил у моего мужа 13 000 руб<лей> сер<ебром> и посему, разумеется, муж мой вынужден был сутягаться с своими обидчиками» [5, л. 108].

Страпчы па крымінальных справах Чуліцкі 23 ліпеня 1857 года паведамляў віцебскаму губернатару: «Соломин <...> показал, что найденные у него при обыске штемпели для делания фальшивой монеты ему подброшены агентом любавинского раввина, проживающего в г. Витебске <...> Ароном Гурвичем> [5, л. 113]. 13 верасня

1857 года Чуліцкі дадае, што «арестант <...> Соломин <...> сослался на то, что ямщик <...> Филипп видел много раз, как Гурвич посещал его, Соломина <...> и посему <...> просил допросить мещанина Филиппа в сем предмете под присягою» [5, л. 116].

Знаходзячыся ў вязніцы, Саломін вырашыў змяніць сваё веравызнанне. 10 лютага 1858 года віцебская палата крымінальнага суда праінфармавала віцебскага губернатара, што Саломін выказаў жаданне «принять св. крещение, которое над ним совершено 22 марта» [5, л. 140].

У далейшым следства прызнала, што «штемпеля для делания монеты <...> найдены в том месте, в котором не было их при обыске накануне того дня, и квартира отсутствовавшего Соломина найдена незапертой <...> тогда как нельзя допустить, чтобы Соломин сам не запер помещения своего, <...> имея у себя такую вещь, от которой зависит его участь <...> По сим соображениям Уголовная палата решением, составленным 10 апреля 1858 г. определила: 1. Подсудимого Залку Мовшова по Святому крещению Алексея Александровича Соломина, 48 лет <...> освободить от ответственности по сему делу <...> 4. Найденные <...> штемпели, способные к подделке полуимпериалов, <...> отослать для уничтожения к начальнику С.П.бургского Монетного двора» [5, л. 134 аб. — 135 аб.].

Але пакуты Саломіна на гэтым не скончыліся. 10 мая 1858 года віцебскаму губернатару паступіла паведамленне ад віцебскага земскага іспраўніка аб тым, што ў выніку паўторнага вобыску «у перекреста из евреев Алексея Соломина, недавно освобожденного из тюремного замка», было знойдзена «одно подозрительное письмо» Саломіна да сына і «в сапоге три билета пятирублёвого достоинства» [5, л. 3].

У наступных дакументах справы адзначана, што ў ходзе гэтага вобыска пры аглядзе «старой головной сафьяновой подушки, которая была распорота самим перекрестом Соломиным в руках моих, <...> в углу <...> чехла оказался один запачканный билет двадцатипятирублевого достоинства, который вынут мною был в присутствии всех и по осмотру оного всеми присутствующими, признан фальшивым 1855 года под № 41311 <...>» [5, л. 6 — 7].

Яшчэ да пачатку вобыска Аляксей Саломін абвясціў, што мае падазрэнне на нейкага бешанковіцкага месціча Гершена Пялоўскага, які неаднаразова прыходзіў да яго і меў магчымасць падкінуць «чего-либо в платье или сундук»» [5, л. 8].

20 мая 1858 года з віцебскай казёнай палаты паступілі вынікі экспертызы чатырох крэдытных білетаў на 40 рублёў, дзе ўказана, што «из них три билета пятирублёвага достоинства <...> 1856 года есть действительные» [5, л. 30].

25 мая 1858 года ад маёра штаб-афіцэра корпуса жандармаў Лоева віцебскаму губернатару паступае паведамленне, што «фальшивая ассигнация была действительно подброшена Соломину <...>» [5, л. 35].

Працягваюць узгадвацца на старонках справы і абвінавачаныя Аляксеем Саломіным у падкладанні яму грашовых фальсіфікатаў Гурвіч, Зэліксон і іншыя. 17 ліпеня 1858 года віцебскі губернскі пракурор указвае, што арыштант Арон Гурвіч спрабаваў падкупіць радавога мясцовага гарнізонага батальёна з мэтай падкідвання Саломіну фальшывага крэдытнага білета і нават забойства апошняга [5, л. 55]. 5 жніўня 1858 года быў арыштаваны аршанскі месціч Берка Азёрнаў, абвінавачваны ў подкупе двараніна Нядвецкага для падкладання Саломіну ў астрозе фальшывага білета [5, л. 77 – 77 аб.].

30 верасня 1858 года віцебскаму губернатару паступіў ліст ад купецкай жонкі Рыўкі Зэліксонавай. Яна просіць вызваліць свайго сына Залмана, які ўжо больш за тры месяца знаходзіцца ў вязніцы па справе аб знойдзеных фальшывых білетах у нейкага вызваленага арыштанта Саломіна. Маці піша, што «между тем, силы страдальца сына моего день ото дня ослабевают, не говоря уже о торговле нашей, которая <...> доведена до крайнего разорения» [5, л. 84 аб.].

У рапарце 11 кастрычніка 1858 года чыноўніка асобых даручэнняў Дамантовіча паведамляецца, што ратман віцебскага магістрата Залман Зэліксон, абвінавачаны ў фальшэрстве, быў заключаны ў вязніцу. З вязніцы Зэліксон вёў перапіску з бацькам, які раіў яму «ни в чем не признаваться и надеяться, что, когда воротятся из Петербурга богатые евреи, то успеют его освободить» [5, л. 77].

Віцебскі ўездны страпчы Кладніцкі данасіў губернатару аб тым, што месціч Хейфіц, які сам быў пад следствам па справе аб бойцы і падпальванні будынкаў віцяблянаў, 27 ліпеня 1858 года расказаў, што жонка нейкага Руценштэйна мяняла ў лаўцы фальшывыя крэдытныя білеты, а сам Руценштэйн імкнуўся загубіць Саломіна, абяцаючы Хейфіцу «прекратить с ним дело о драке с тем только, чтобы Хейфиц подбросил Соломину 5 фальшивых полуимпериалов» [5, л. 169 – 169 аб.].

Паралельна з гэтай справай разгортваўся працэс пошуку фальшываманетчыкаў і «переводителей фальшивой звонкой монеты и кредитных билетов» на тэрыторыі губерні.

31 ліпеня 1858 года віцебскі губернатар атрымаў ад сенатара, які рэвізаваў губерню, інфармацыю аб тым, што напярэдадні да яго з'явіўся месціч Карп Васільеў Стэльмашэўскі разам са свяшчэннікам старасельскай царквы, якія прадставілі 27 дваццаціпяцірублёвых фальшывых крэдытных білетаў, знойдзеных імі ў свіным хляву пры карчме [5, л. 63].

11 лістапада 1858 года віцебскія ўлады атрымалі ад губернатара Магілёва ліст, у якім распавядалася аб арышце ў горадзе «делателя фальшивой звонкой монеты по преимуществу серебряных рублей; сверх того, в г. Копыси и Оршанском уезде открыты делатели и переводители фальшивых кредитных билетов 10- и 50-рублевого достоинства на сумму 8170 руб. и разные снаряды, служивые для подделки 5-ти и 10- и 50-рублевых билетов» [5, л. 155].

У рапарце ад 4 снежня 1858 года камісія па разгляду дзейнасці фальшываманетчыкаў у Віцебску адзначала, што «арестант Гершен Руценштейн показывал <...> что в г. Могилеве или вблизи его человек шесть занимаются подделкою фальшивых билетов, что там есть две фабрики: одна, где делаются 10-рублевые, а другая — 25-рублевые фальшивые билеты, и, наконец, что скоро будут делать 50-ти рублёвые, для чего куплена машина за 140 рублей серебром» [5, л. 160 — 160 аб.]. Натуральна, што такія фальшывыя білеты маглі распаўсюджвацца і на тэрыторыі Віцебскай губерні.

11 снежня 1858 года віцебскі губернскі пракурор паведамляў, што пад стражу па абвінавачванні ў распаўсюджванні фальшывых крэдытных білетаў былі ўзяты 11 чалавек [5, л. 199].

Між тым справа Аляксея Саломіна працягвалася. 30 студзеня 1859 года ён падае губернатару прашэнне, у якім указвае, што, «отделавшись при защите Правительства от неоднократных в течение четырехлетнего преследования нападений со стороны евреев-хасидов, мне предстоит новая напасть со стороны частного пристава Эйсмонта, состоящего в связях с ними <...>». Прыстаў падаў іскавую скаргу, у якой абвінаваціў Саломіна ў знявазе, выказанай апошнім, калі той скардзіўся на Эйсмонта за «неправильные действия» [5, л. 270].

У прашэнні Аляксей Саломін адзначае: «проездом из С.-Петербурга чрез Витебск в 1856 г. я остановился в <...> заездном доме, содержимом еврейкою Ривкою Бравой» і пакінуў ёй на захаванне перад арыштам «денег 450 руб. и вещей на 479 руб.» [5, л. 270].

Далей Саломін піша, што «более 20 лет занимался шоссейными подрядами, до преследования имел большое состояние, пользовался

всеобщим по званию моему уважению, никогда не бывал в тюрьмах <...> имущество мое осталось на произвол Бравой <...> слухи о том, что она распродает мои вещи дошли и до тюрьмы, откуда я обратился с прошением к г. прокурору, прося его заставить Бравую возвратить мои вещи и деньги <...>» [5, л. 270 аб.]. Спыніць самавольства было даручана прыставу Эйсманту, але той цягнуў час, дазваляючы Бравай далейшае рабаванне чужой маёмасці. Эйсмант, скардзіцца Саломін, «показывал <...> меня, окруженного конвоем, в арестантской одежде и обремененного цепями. Бравые любовались моим положением <...> Это повторялось более десяти раз» [5, л. 270].

У далейшым прыстаў усімі спосабамі зацягваў ход справы. «Что могло побуждать г. Пристава Эйсмонта к подобным поступкам как не подарки» [5, л. 270], — усклікае Саломін і робіць выснову: «не имел ли я вполне законного права отзываться о Приставе Эйсмонте в тех выражениях, на кои он указывает в своей жалобе <...>», просіць садзейнічаць у разглядзе справы аб вяртанні маёмасці [5, л. 273].

У адказ у дастаткова сціслым тлумачэнні прыстаў Сямён Эйсмант піша, што «в настоящее время, будучи одержим сильною болезниею <...> нахожусь в больнице, больше никакого объяснения дать не могу, впредь до выздоровления и выхода из больницы» [5, л. 297].

5 мая 1867 года віцебскаму губернатару паступіла паўторная просьба Аляксея Саломіна, у якой ён зноў прасіў аб садзейнічанні да хутчэйшага сканчэння справы па разрабаванай маёмасці [5, л. 341]. 7 жніўня 1868 года Віцебскае губернскае праўленне атрымала паведамленне, што «купец Алексей Соломин выбыл в г. Киев» [5, л. 367].

Гэтым скончылася 12-гадовая судовая справа віцебскага 2 гільдыі купца Аляксея Саломіна, які, не будучы фальшываманетчыкам, стаў яе паднявольным удзельнікам.

*Літаратура і крыніцы*


1. Васюков, А.И. Бумажные денежные знаки России и СССР / А.И. Васюков, В.В. Горшков, В.И. Колесников, М.М.Чистяков. — С.-Петербург.: Политехника, 1994. — 215 с.
2. Грималаускайте, Д.О некоторых признаках фальсифицированных кредитных билетов Российской империи 1843 — 1854 гг. //Д. Грималаускайте // Пятнадцатая Всероссийская нумизматическая конференция: тез. докл. и сообщ. — Москва, 2009. — С. 192 — 194.

3. Колобова, И. Зарубежные центры по подделке российских кредитных билетов (вторая половина XIX в.) / И. Колобова // Pieniądz – kapital – praca – wspólne dziedzictwo Europy – Białorus Litwa Łotwa Polska Rosja – Słowacia, Ukraina. Materialy z VIII Miedzynarodowej Konferencji Numizmatyczne. – Warszawa, 2008. – S. 193 – 197.

4. Колобова, И.Н. Фальшивые российские кредитные билеты на территории Витебской губернии во второй половине XIX в. / И.Н. Колобова // Пятнадцатая Всероссийская нумизматическая конференция: тез. докл. и сообщ. – Москва, 2009. – С. 195 – 196.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 1430. Воп. – 1. – Спр. 30391. Дело по рапорту Витебского земского исправника...

6. Орлов, А.П. Бумажные денежные знаки в Беларуси / А.П. Орлов. – Мінск : Минская фабрика цветной печати, 2008. – 696 с.

7. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Мінск : Полымя, 1995. – 687 с.